## 1000-ГАДОВАЯ ГІСТОРЫЯ БРЭСТА: АД СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА СУЧАСНАСЦІ

У 2019 г. праходзіць шырокамаштабнае святкаванне 1000-годдзя Брэста. А першыя ўрачыстыя юбілейныя святкаванні былі звязаны з 950-годдзем горада. Пры гэтым трэба адзначыць, што першапачаткова планавалася той юбілей адзначыць яшчэ ў 1967 г. Паводле пратакола пасяджэння бюро Брэсцкага абкама партыі ад 13 лютага 1967 г., па прапанове Брэсцкага гаркама КПБ і гарсавета абкам партыі хадайнічаў перад ЦК КПБ аб дазволе на *"проведение в мае 1967 года празднования 950-летия города Бреста"* ў сувязі з тым, што *"в 1967 году исполняется 950 лет со времени первого летописного упоминания о городе Бресте"* [9, арк. 17]. Афіцыйнага разгляду гэтага пытання ў ЦК КПБ не было. Станоўчага адказу адтуль не атрымалі. На наш погляд, на гэта паўплывалі наступныя акалічнасці: па-першае, ішлі навуковыя спрэчкі адносна першага летапіснага згадвання Бярэсця (1017 ці 1019 г.), якія працягваюцца і цяпер; па-другое, на май 1967 г. былі запланаваны ўрачыстасці да 900-годдзя Мінска. У верасні 1968 г. Брэсцкі гарком партыі ізноў прапанаваў правесці святкаванне 950-годдзя Брэста – ужо 17 верасня 1969 г. Паводле пратакола пасяджэння Брэсцкага абкама партыі ад 13 студзеня 1969 г., такое рашэнне абгрунтоўвалася тым, што *"в 1969 году исполняется 950 лет со времени первых летописных упоминаний о существовании города Бреста"* [10, арк. 19–20]. Пасля абмеркаванняў у гарвыканкаме, гаркаме і абкаме партыі нарэшце на пасяджэнні бюро Брэсцкага абкама 20 сакавіка 1969 г. канчаткова было прынята рашэнне аб правядзенні святкавання 950-годдзя горада 23–25 мая 1969 г. [11, арк. 83].

На карысць менавіта 1019 г. як пачатку летапіснай гісторыі Брэста паўплывалі вынікі археалагічных раскопак пад кіраўніцтвам П. Ф. Лысенкі, якія праводзіліся на працягу 1969–1981, 1988 гг. на месцы гарадзішча. У 1982 г. быў адкрыты археалагічны музей "Бярэсце" – адзіны ў свеце музей сярэдневяковага ўсходнеславянскага горада, які размешчаны на месцы гарадзішча старажытнага Бярэсця. Сярод унікальных шэдэўраў, знойдзеных пры раскопках, варта адзначыць самшытавы грэбень з выразанымі 13 літарамі кірыліцы.

Аднак вытокі горада бяруць пачатак яшчэ ў другой палове X ст. Пра гэта сведчаць праведзеныя археалагічныя даследаванні згаданага П. Ф. Лысенкі ў 2006 г. Паводле яго высноў, па часе ўзнікнення Бярэсце з'яўляецца трэцім старажытным горадам на тэрыторыі Беларусі пасля Полацка (862 г.) і Турава (980 г.).

Старажытны горад Бярэсце паўстаў у месцы зліцця рэк Заходні Буг і Мухавец, на скрыжаванні гандлёвых шляхоў. Ужо ў першыя стагоддзі яго гісторыі склалася традыцыйная структура сярэдневяковага горада, якая ўключала дзяцінец і навакольны горад. З 1182 г. у польскіх хроніках узгадваўся Берасцейскі замак.

Зыходзячы з горадабудаўнічых традыцый і дасягненняў, планіроўкі горада, узвядзення буйных фартыфікацыйных умацаванняў (крэпасці), гісторыя Брэста ўмоўна падзяляецца на два храналагічныя адрэзкі: X–XI стст. – 30-я гг. XIX ст. (старажытнае Бярэсце, сярэднявяковы горад) і 40-я гг. XIX ст. – пачатак

XXI ст. (новы Брэст). Рубяжом паміж імі стала ўзвядзенне Брэсцкай крэпасці і будаўніцтва гарадскіх аб'ектаў на новым месцы – на фарштатах крэпасці. З 40-х гг. XIX ст. горад развіваўся пераважна за кошт пашырэння тэрыторыі Кобрынскага фарштата.

У сваю чаргу, зыходзячы з уваходжання Брэста ў склад розных дзяржаўна-палітычных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў, можна вылучыць найбольш значныя перыяды ў яго гісторыі: у складзе старажытнарускіх княстваў, ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, Польшчы паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі, у межах БССР, у незалежнай Рэспубліцы Беларусь.

З XI ст. да сярэдзіны XII ст. Бярэсце ўваходзіла ў склад Тураўскага княства. У 1044 г. горад увайшоў ва ўладанні кіеўскага князя Яраслава Мудрага (Кіеўскае княства). Любечскі з'езд князёў 1097 г. замацаваў Бярэсце за тураўскім князем Святаполкам Ізяславічам, г. зн. пакінуў у складзе Тураўскага княства. З другой паловы XII ст. горад уваходзіў у склад Уладзіміра-Валынскага княства. Польскія князі рабілі неаднаразовыя ваенныя паходы, каб завалодаць горадам. Паводле Вялікай хронікі XIV ст., у 1179 г. польскі князь Казімір II Справядлівы ўзяў у кіраванне Бярэсце. У 1182 г. адбыўся чарговы паход Казіміра II на Бярэсце. У 1199 г. гэта быў горад Галіцка-Валынскага княства.

Бярэсце было ўключана ў склад ВКЛ у пачатку XIV ст. пры вялікім князі Віцені ў 1315 г. (паводле іншай версіі – пры вялікім князі Гедыміне ў 1319 г.). З 1320-х гг. было "вотчынай" князя Гедыміна ў складзе галіцка-валынскіх зямель. Яго спадчыннікі – сыны Альгерд і Кейстут – у 1345 г. падзялілі ВКЛ на Віленскую і Трокскую паловы. Бярэсце ўвайшло ў Трокскую палову Кейстута і яго нашчадкаў. Берасцейскай воласцю кіраваў намеснік вялікага князя. Польскі кароль Казімір III у ходзе вайны за галіцка-валынскую спадчыну ў 1349 г. некалькі месяцаў часова займаў Бярэсце. Паводле дамовы аб перамір'і 1350 г., Берасцейская зямля засталася ў складзе ВКЛ. Бярэсце і замак належалі Кейстуту да яго смерці ў 1382 г. У 1384 г. сын Кейстута Вітаўт атрымаў у кіраванне Гарадзенскае княства і Берасцейскую зямлю. Пасля Крэўскай уніі 1385 г. Бярэсце стала буйным адміністрацыйным і гандлёва-рамесным цэнтрам. Горад Бярэсце як былы надзел Кейстутавічаў быў далучаны Вітаўтам да вялікакняжацкага дамену.

Бярэсце першым з беларускіх гарадоў атрымала Магдэбургскае права. 15 жніўня 1390 г. у Кракаве мяшчане Бярэсця атрымалі прывілей польскага караля Уладзіслава II Ягайлы аб наданні гораду Магдэбургскага права (пасля яно неаднаразова пацвярджалася). Органам гарадскога самакіравання быў магістрат, які складаўся з рады (савета) і лавы. Узначальваў магістрат войт, які прызначаўся вялікім князем. Рада выбіралася штогод на агульным сходзе мяшчан, яе ўзначальвалі 1–2 бурмістры з ліку радцаў. Бурмістру і гарадской радзе падпарадкоўвалася адміністрацыя горада. У магістрат адбіраліся радцы (члены рады) і лаўнікі. Лаўнікі разам з войтам складалі войтаўска-лаўніцкі суд, які разбіраў крымінальныя справы, маёмасныя спрэчкі.

З 1413 г. Бярэсце стала цэнтрам Берасцейскага староства ў складзе Трокскага ваяводства. У грамаце вялікага князя Казіміра за 1444 г. сярод

15 "лепшых" (галоўных) гарадоў ВКЛ названа і Бярэсце [4, с. 332]. У 1517 г. са складу Трокскага ваяводства выдзелена Падляшска-Берасцейскае (Падляшскае) ваяводства. У 1520 г. Бярэсце стала цэнтрам Берасцейскага павета ў складзе Падляшскага ваяводства. У ходзе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы ў ВКЛ у 1566 г. створана Берасцейскае ваяводства (цэнтр – горад Бярэсце). Берасцейскае ваяводства падзялялася на Берасцейскі (у яго ўвайшлі былыя Берасцейскі і Камянецкі паветы) і Пінскі (уключаны былыя Пінскае, Кобрынскае, Тураўскае, Давыд-Гарадоцкае, Дубровіцкае княствы). Першым берасцейскім ваяводам быў Ю. Тышкевіч.

Важнай падзеяй культурнага жыцця старажытнага Бярэсця было выданне Біблії (Берасцейскай Біблії, Радзівілаўскай Біблії), якая з'яўляецца помнікам польскамоўнага кнігадрукавання. Кніга, што ўтрымлівала поўны пераклад Біблії на польскую мову, была выдадзена 4 верасня 1563 г. у друкарні ў Бярэсці па загаду і пры фінансавай падтрымцы (10 тыс. дукатаў) берасцейскага старасты князя Мікалая Радзівіла (мянушка "Чорны"), аднаго з кіраўнікоў кальвіністаў у ВКЛ. У перакладзе ўдзельнічалі запрошаныя з Малой Польшчы кальвінісцкія тэолагі, сярод якіх Ян Ласкі (яго лічаць ініцыятарам выдання), Рыгор (Гжэгаж) Орсацывуш (Оршак), Францыск Сканкор, Пётр Статорыус (Стоіньскі), Андрэй Тшэцецкі, Георг Шоман, Якуб Любельчык, Францішак Лізманін, Бернард Охін. У падрыхтоўцы выдання ўдзельнічаў буйны арыянскі тэолаг Павел з Бжэзін. Магчыма, друкаваннем займаўся кіраўнік Берасцейскай друкарні Ц. Базылік. Кніга была буйнейшым друкаваным выданнем ВКЛ XVI–XVIII стст. і выдадзена фарматам "у аркуш", яе аб'ём складаў 738 старонак [6, с. 176–181]. Упершыню ў гісторыі кнігадрукавання на Беларусі змешчаны прадметны паказальнік. Наклад выдання Брэсцкай Біблії складаў ад 500 да 1000 асобнікаў. Пашыраным з'яўляецца меркаванне, што ў час Контррэфармацыі Біблія знішчалася па загаду Мікалая Крыштафа Радзівіла (мянушка "Сіротка") і была ўключана Рымска-каталіцкай царквой у індэкс забароненых кніг, але Віленскі сінод 1617 г. пастанавіў, каб яна была пры кожным кальвінісцкім зборы ВКЛ. Аднак культуролаг А. Суша абвяргае тое, што гэтая Біблія знішчалася сынамі М. Радзівіла Чорнага. Паводле некаторых ацэнак, у свеце захаваліся 130 экзэмпляраў кнігі, у т. л. у Беларусі – адзін у Мінску (у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі) і адзін у Брэсце. 6 верасня 2019 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падараваў жыхарам г. Брэста да 1000-гадовага юбілею ўнікальны экзэмпляр Брэсцкай Біблії (захоўваецца ў Музеі гісторыі горада Брэста), а таксама фрагмент выдання ў сектары рэдкай кнігі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага. У 2019 г. рэалізаваны праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Выдавецкага дома «Сегмент» і ЗАТ "Белнафтастрах" па вырабу факсімільнага выдання Брэсцкай Біблії. Экзэмпляры факсімільнага выдання перададзены бібліятэкам і музеям г. Брэста. У 2017 г. на перакрыжаванні вуліц Пушкінскай і Кірава каля Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага ў гонар 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ўсталяваны памятны знак Брэсцкай Біблії (скульптар – А. Нічыпарук).

Памежнае становішча Брэста прадвызначыла на працягу ўсёй яго 1000-гадовай гісторыі поліэтнічны, поліканфесійны характар яго культурнай спадчыны. З глыбокай старажытнасці да сучаснасці тут перапляліся традыцыі і звычаі беларускага, польскага, яўрэйскага, рускага, украінскага і іншых народаў, хрысціянскія (праваслаўныя, каталіцкія, пратэстанцкія) і нехрысціянскія (іудаізм) каштоўнасці.

У склад Рэчы Паспалітай, створанай паводле заключанай 1 ліпеня 1569 г. Люблінскай уніі, увайшло і Берасцейскае ваяводства ВКЛ. З сярэдзіны XVII ст. у дакументах горад усё часцей называецца Брэстам Літоўскім. Хоць вальны сейм Рэчы Паспалітай 1776 г. адмяніў Магдэбургскае права ў шэрагу гарадоў і мястэчак, аднак Брэст захаваў гэтае права.

Адной са значных падзей стала Брэсцкая унія 1596 г. Сабор прыхільнікаў уніі адкрыўся ў Брэсце 6 кастрычніка 1596 г. На ім прысутнічалі папскія паслы, прадстаўнікі караля Рэчы Паспалітай, мітрапаліт, 5 з 7 епіскапаў, дзяржаўныя дзеячы – ваявода Мікалай Крыштаф Радзівіл, канцлер ВКЛ Леў Сапега. Акт уніі быў прыняты 8 кастрычніка 1596 г. Сутнасць уніі заключалася ў прыняцці каталіцкага веравучэння і пераходзе ў падпарадкаванне рымскаму папе з адначасовым захаваннем набажэнства візантыйскай літургічнай традыцыі на царкоўнаславянскай мове. Брэсцкая унія прывяла да ўзнікнення на тэрыторыі Рэчы Паспалітай уніяцкай царквы. Падпісанне Брэсцкай уніі 1596 г. абвастрыла міжканфесійную сітуацыю на беларускіх землях [4, с. 540].

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795 г.) Брэст-Літоўск увайшоў у Расійскую імперыю як павятовы горад Слонімскай губерні (у 1797 г. – Літоўскай губерні, у 1801 г. – Гродзенскай губерні, у складзе якой знаходзіўся да жніўня 1915 г.). Царскія ўлады запаволена і непаслядоўна праводзілі палітыку па ўніфікацыі беларускага гарадскога самакіравання з агульнарасійскім. Новая сістэма гарадскога самакіравання знаходзілася ў падпарадкаванні і пад кантролем адміністрацыі ўсіх узроўняў. Непасрэдна за стан горада адказвалі граданачальнік і паліцмайстар, якім падпарадкоўваліся чыноўнікі і паліцэйскія. Згодна з гарадской рэформай 1870-х гг., уводзіўся новы ўсесаслоўны орган гарадскога самакіравання – гарадская дума. У Гродзенскай губерні першым павятовым горадам, дзе з'явіліся органы самакіравання, у 1877 г. стаў Брэст-Літоўск.

Будаўніцтва Брэсцкай крэпасці ў 1836–1842 гг. прадвызначыла перанос горада на новае месца (на 2,5 км на ўсход). У 1835 г. на тэрыторыі, адведзенай для крэпасці, поўнасцю забаранілі ўзводзіць жылыя будынкі, а ў 1840 г. вырашана выселіць усіх жыхароў з крэпасці. Культавыя і грамадскія пабудовы XVII–XVIII стст. былі разбураны ці прыстасаваны для ваенных патрэб. Такім чынам, агульнадзяржаўныя інтарэсы Расійскай імперыі сталі дамінуючымі ў параўнанні з асабістымі інтарэсамі жыхароў горада. Яны і прадвызначылі незайздросны лёс сярэдневяковага Бярэсця, перанос горада на новае месца. Далей Брэст-Літоўск развіваўся на 3-х фарштатах крэпасці, пераважна на Кобрынскім. Пачалася яго забудова вакол вуліц Шасейнай (цяпер праспект Машэрава), Мільённай (цяпер вуліца Савецкая) і іншых, якія ўваходзяць у гістарычны цэнтр цяперашняга Брэста.

На працягу ўсёй гісторыі горад вельмі часта падвяргаўся рабаванню і спальванню ў час войн і нападаў захопнікаў. Пасля гэтага даводзілася доўга і напружана працаваць, каб ізноў адраджаць горад. Страты (нярэдка велізарныя па маштабах) ад пажараў былі і ў мірны час. Так, 4–5 мая 1895 г. у Брэсце адбыўся вялікі пажар, у ходзе якога была знішчана ўся цэнтральная частка горада – 1600 дамоў, багадзельня, прыют, 2 бальніцы, 2 вучылішчы, аптэкі, 104 прадуктовыя крамы. 28 красавіка 1901 г. у горадзе ізноў быў вялікі пажар – пацярпела каля 20 тыс. жыхароў.

Чарговыя буйныя страты горад атрымаў у час Першай сусветнай вайны. У жніўні 1915 г. пры адступленні расійскай арміі Брэст быў разбураны. Усяго за вайну былі знішчаны 2500 будынкаў з 3670, 1500 хат з 1700 [3, с. 12]. Горад быў заняты войскамі кайзераўскай Германіі.

У канцы 1917 – пачатку 1918 гг. Брэст-Літоўск быў уключаны ў арбіту вялікай дыпламатыі. З 9 (22) снежня 1917 г. да 3 сакавіка 1918 г. у Брэсцкай крэпасці праводзіліся мірныя перамовы, якія неаднаразова перапыняліся з-за рознагалоссяў бакоў, вострай унутрыпартыйнай і публічнай дыскусіі ў савецкай Расіі, суправаджаліся аднаўленнем ваенных дзеянняў – 18 лютага 1918 г. аўстра-германскія войскі пачалі наступленне і занялі большую частку Беларусі. Паводле ўмоў Брэсцкага мірнага дагавора 27 студзеня (9 лютага) 1918 г., заключанага дзяржавамі Чацвярнога саюза (Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй) з Украінскай Народнай Рэспублікай, Брэст-Літоўск быў перададзены УНР. А 3 сакавіка 1918 г. у Белым палацы (захаваліся толькі яго руіны) на тэрыторыі крэпасці быў заключаны Брэсцкі (Брэст-Літоўскі) мірны дагавор паміж савецкай Расіяй і краінамі Чацвярнога саюза. У складаных умовах савецкая Расія, якая была няздольнай працягваць ваенныя дзеянні, прыняла нямецкія ўмовы міру. Дагавор складаўся з 14 артыкулаў і розных дадаткаў. Нямецкай акупацыі падлягалі прыбалтыйскія землі (Курляндыя, Ліфляндыя, Эстляндыя) і частка Беларусі. Тэрыторыя Беларусі падзялялася па лініі Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Пружаны – Брэст. Расія абавязана была вывесці войска з тэрыторыі Асманскай імперыі, перадаць ёй на Каўказе акругі Карс, Ардаган і Батум. Украіна і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі. Ад Расіі адыходзіла 26 % тэрыторыі (каля 1 млн 210 тыс. км$^2$) з насельніцтвам 56 млн чалавек (каля трэці насельніцтва еўрапейскай часткі былой Расійскай імперыі). Яна абавязвалася правесці дэмабілізацыю арміі і разбраенне флоту, прыняць рэжым гандлю з Германіяй ад 1904 г. [12, с. 13–17, 19–23].

Чарговы перыяд гісторыі Брэста быў звязаны з адроджанай Польскай дзяржавай. 9 лютага 1919 г. горад занялі польскія войскі. На непрацяглы час – з 1 па 18 жніўня 1920 г. – у Брэсце была ўстаноўлена савецкая ўлада. Паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г., заходнебеларускія землі (у тым ліку Брэст-Літоўск) увайшлі ў склад Польшчы. Брэст-Літоўск (з 1923 г. Брэст-над-Бугам) стаў цэнтрам Палескага ваяводства, у склад якога ўваходзілі Брэсцкі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі (у 1935–1939 гг. – Івацэвіцкі), Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Столінскі, а таксама населеныя пераважна ўкраінцамі Сарненскі (да 1930 г.) і Камень-Кашырскі паветы. Органы гарадскога

самакіравання пачалі ствараціца на заходнебеларускіх землях паводле распараджэння Грамадзянскага кіравання ўсходніх земляў ад 25 чэрвеня 1919 г. Гарадская рада (савет) з'яўлялася прадстаўнічым органам улады ў гарадской гміне. Выканаўчым органам гарадской гміны з'яўляўся магістрат, які ўзначальваў прэзідэнт, яго намеснік (віцэ-прэзідэнт). Як правіла, пасады прэзідэнта горада займалі толькі палякі (у 1930-я гг. пераважна былыя вайскоўцы). У 1929 г. у склад горада былі ўключаны яго прадмесці: Кіеўка, Грасўка і Шпановічы. У 1933 г. замест магістрата выканаўчым органам гарадской гміны стала гарадское ўпраўленне [1, с. 52–57].

У 1921–1939 гг. на сучаснай вуліцы Леніна быў заснаваны новы адміністрацыйны цэнтр. Архітэктарам Ю. Лісецкім узводзіліся жылыя пабудовы калоній "Схроніска", калоніі Г. Нарутовіча, "Тартак", "Афіцэрскай калоніі". Сярод асабнякоў, буйных грамадскіх пабудоў, што ўцалелі да сучаснасці, трэба адзначыць асабнякі Ю. Лісецкага па вуліцы Леванеўскага (цяпер – Музей гісторыі горада) і вуліцы Леніна (зараз музей "Выратаваныя мастацкія каштоўнасці"). У 1925 г. у стылі неакласіцызму архітэктар С. Філясевіч узвёў будынак аддзялення Банка Польскага (цяпер там размяшчаецца Галоўнае ўпраўленне Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці). У стылі функцыяналізму ў 1938 г. пабудаваны гмах Палескага ваяводскага ўпраўлення (да яго ў 1960-я гг. дабудаваны 2 крылы) – зараз там знаходзіцца Брэсцкі аблвыканкам. Канструктывізм пераважаў у гарадской архітэктуры таго часу.

Непрацяглым быў прамежак часу ад верасня 1939 г. да 22 чэрвеня 1941 г., калі ў горадзе ўсталявалася савецкая ўлада. 22 верасня 1939 г. у Брэсце сфарміравана Часовае кіраванне. З восені 1939 г. у горадзе пачалі праводзіцца палітычныя, эканамічныя, сацыяльна-культурныя пераўтварэнні на савецкай аснове. 4 снежня 1939 г. была ўтворана ў складзе БССР Брэсцкая вобласць з цэнтрам у г. Брэсце.

Няпростымі ў гісторыі горада і крэпасці былі гады Вялікай Айчыннай вайны. На працягу многіх дзесяцігоддзяў савецкага перыяду і ў постсавецкі час абарона Брэсцкай крэпасці ў чэрвені – ліпені 1941 г. была і застаецца сімвалам стойкасці і мужнасці абаронцаў Айчыны. Нягледзячы на велізарныя людскія страты, абаронцы здолелі аб'яднаць свае намаганні. 24 чэрвеня 1941 г. быў падрыхтаваны загад № 1, утворана зводная баявая група на чале з капітанам І. Зубачовым, палкавым камісарам Я. Фаміным. З захопам Усходняга форта арганізаваная абарона Брэсцкай крэпасці скончылася, аднак у асобных казематах працягвалася змаганне – маёр П. Гаўрылаў трапіў у варожы палон толькі 23 ліпеня 1941 г.

Пра гэтую старонку ваеннай гісторыі ў СССР і за мяжой даведаліся дзякуючы старанням савецкага пісьменніка Смірнова Сяргея Сяргеевіча, лаўрэата Ленінскай прэміі, які прысвяціў вывучэнню абароны Брэсцкай крэпасці і пошуку яе абаронцаў 10 гадоў жыцця. 8 мая 1965 г. ёй было прысвоена званне "Крэпасць-герой", уручаны ордэн Леніна і медаль "Залатая Зорка". Больш за 200 удзельнікаў абароны былі ўзнагароджаны медалямі і ордэнамі. А 25 верасня 1971 г. на тэрыторыі крэпасці быў адкрыты мемарыяльны комплекс "Брэсцкая

крэпасць-герой", у стварэнні якога прымала ўдзел група вядомых майстроў манументальнага мастацтва: архітэктары У. Кароль, В. Волчак, В. Занковіч, скульптары У. Кібальнікаў, А. Бембель, У. Бабыль і інш. Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" цяпер з'яўляецца адным з самых наведвальных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Тут дарэчы будуць словы прывітальнай тэлеграмы пісьменніка С. Смірнова (май 1969 г.), якія не страцілі сваёй актуальнасці: "*Годы работы над историей обороны крепости-героя Бреста превратили меня в брестчанина, одного из патриотов вашего замечательного города. Каждый раз, бывая у вас, любуюсь тем, как растёт и хорошеет ваш дорогой мне город. Желаю Вам, дорогие мои земляки-брестчане, новых успехов во всех областях вашей многосторонней деятельности. Пусть ещё краше, шире и зеленее становится ваш город – парадный подъезд нашей великой Родины. Пусть молодое поколение брестчан свято хранит в своей памяти великий подвиг защитников крепости-героя ...*" [14].

У час нямецка-фашысцкай акупацыі ў 1941–1944 гг. Брэст з большай часткай Брэсцкай вобласці быў уключаны ў склад рэйхскамісарыята "Украіна". У лютым 1944 г. горад быў перададзены ў генеральную акругу "Беларусь" рэйхскамісарыята "Остланд". Адносна мясцовага насельніцтва акупацыйныя ўлады ажыццяўлялі гвалт і генацыд. Адной з самых страшных падзей стала знішчэнне яўрэйскага гета ў Брэсце 15–18 кастрычніка 1942 г. На старонцы ў кнізе ўліку насельніцтва г. Брэста аб колькасці жыхароў па нацыянальнасці на 15, 16 і 17 кастрычніка 1942 г. была закрэслена лічба аб колькасці яўрэйскага насельніцтва (16 934 чалавекі) і пастаўлены прочырк [2, с. 281]. З усёй брэсцкай яўрэйскай абшчыны ўратаваліся адзінкі людзей.

Пасля вызвалення Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 28 ліпеня 1944 г. пачалося аднаўленне савецкіх і партыйных органаў улады. У 1944–1991 гг. у горадзе размяшчаліся кіруючыя структуры абласнога, раённага і гарадскога ўзроўняў: Брэсцкі абкам, райкам і гарвыканкам КПБ, Брэсцкі аблвыканкам, райвыканкам і гарвыканкам і інш. У 1954 г. у склад Брэсцкай вобласці ўвайшлі адміністрацыйныя раёны скасаваных Пінскай і часткі Баранавіцкай абласцей. У 1978 г. у Брэсце былі створаны два адміністрацыйна-тэрытарыяльныя раёны – Ленінскі і Маскоўскі, якія працягваюць існаваць і цяпер.

Пасляваенныя дзесяцігоддзі былі насычаны мірнай і стваральнай працай жыхароў горада. Да 1969 г., калі адзначалася 950-годдзе Брэста, горад ператварыўся ў буйны прамысловы і культурны цэнтр. Аб дынаміцы народанасельніцтва сведчаць звесткі з табліцы 1. Да таго часу былі адноўлены і пабудаваны 33 прамысловыя прадпрыемствы, у горадзе паўсталі новыя галіны прамысловасці: электратэхнічная, прыладабудаванне, тэкстыльная. У сувязі з 50-годдзем БССР і КПБ у студзені 1969 г. горад быў узнагароджаны Ганаровым сцягам, а вялікая група рабочых і служачых адзначана ордэнамі і медалямі. Паводле генеральнага плана 1965 г., прадугледжвалася далейшае развіццё Брэста ва ўсходнім напрамку. Там ужо ўзводзіўся ўсходні прамысловы раён, разгарнулася будаўніцтва мікрараёна "Усход". У 1969 г. галоўны архітэктар

Брэста А. Гарбачоў такім бачыў горад у 2000 г.: *"Исчезнут переулки, расширятся улицы ... Город, конечно, потянется к солнцу – появится новый микрорайон на южном берегу Мухавца. Гостеприимством, благоустроенными мотелями, удобными видами транспорта наш город с каждым годом будет всё больше и больше привлекать внимание туристов"* [8].

Табліца 1 – Дынаміка росту насельніцтва Брэста ў XIV–XXI стст.

| Год | Колькасць жыхароў |
|---|---|
| 1390 | каля 5 тыс. чал. |
| 1861 | 20,9 тыс. чал. |
| 1897 | 46,6 тыс. чал. |
| 1913 | 57,3 тыс. чал. |
| 1939 | 41,4 тыс. чал. |
| 1959 | 73,6 тыс. чал. |
| 2018 | 347,6 тыс. чал. |

Разгорнутае ў пасляваенныя дзесяцігоддзі прамысловае і жыллёвае будаўніцтва прывяло да пашырэння тэрыторыі горада. У 1958 г. у гарадскую рысу Брэста ўключылі 9 прыгарадных сельскіх населеных пунктаў: Адамкова, Бярозаўка 1-я, Бярозаўка 2-я, Ковалёва, Лысая Гара, пасёлак Паўднёвы, пасёлак цагельнага завода № 22, пасёлак мясакамбіната, Соя. У 1968 г. у гарадскую мяжу ўвайшло 7 вёсак: Бярозаўка, Вулька-Падгародская, Гузні, Кацельня-Падгародская, Крушына, Рэчыца, Трышын. У 1979 г. у гарадскую мяжу ўключаны яшчэ 3 вёскі: Дуброўка, Кацін Бор, Пугачова [13, с. 465–474].

З 1991 г. ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь Брэст з'яўляецца цэнтрам Брэсцкай вобласці. У 2007 г. у гарадскую мяжу былі ўключаныя 11 прыгарадных сельскіх населеных пунктаў: Аркадзія, Бярнады, Вычулкі, Гершоны, Казловічы, Кацельня-Баярская, Міцькі, Машчонка, Новыя Задворцы, Плоска, Старыя Задворцы.

Паспяхова пераадолеўшы ў 1990-я гг. – пачатку XXI ст. усе цяжкасці на шляху рэфармавання і мадэрнізацыі, цяпер упэўнена развіваюцца флагманы прамысловасці г. Брэста: ААТ "Савушкін прадукт", СП "Санта Брэмар", Брэсцкі мясакамбінат, СП ААТ "Брэстгазаапарат", Брэсцкі панчошны камбінат, Брэсцкі лікёра-гарэлачны завод "Белалка", "СТіМ", ААТ "Брэсцкі электратэхнічны завод", "Брэсцкі электралямпавы завод", "Берасцейскі пекар" і інш. Выпускаемая імі прадукцыя мае высокую канкурэнтаздольнасць у краіне і за мяжой.

Брэст застаецца буйным міжнародным транспартным вузлом. Вялікі аб'ём грузавых і пасажырскіх перавозак ажыццяўляе Брэсцкае аддзяленне Беларускай чыгункі. Значныя транспартныя паслугі аказваюць аўтавакзал, рачны порт "Брэст", аэрапорт, шматлікія транспартныя арганізацыі.

Па даручэнні і пры падтрымцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі была разгорнута маштабная работа па будаўніцтве і добраўпарадкаванні горада. *"Брест должен стать цветущим и красивым городом, в котором комфортно живется, хорошо отдыхается. Каждый*

*руководитель должен понимать, что когда-нибудь он тоже станет пенсионером и за руку с внуками пойдет по этому городу. А по каким улицам мы поведем своих внуков? Надо для себя, для своих детей сделать город красивым и ухоженным. Населенный пункт, в котором мы живем, это ведь наш общий дом и наводить порядок в нем нужно сообща",* – заявіў кіраўнік дзяржавы 31 сакавіка 2004 г. на сесіі Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў [7]. Забудова праводзілася і працягваецца цяпер у адпаведнасці з генеральным планам г. Брэста 2003 г. (у рамках яго развіцця быў распрацаваны і зацверджаны ў 2019 г. горадабудаўнічы праект). У 2017–2018 гг. распрацавана Стратэгія прасторавага развіцця "Брэст-2050".

Пастаянна ажыццяўляецца планамерная дзейнасць па развіцці сацыяльнай сферы. У 1995 г. Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна, гісторыя якога пачалася яшчэ ў 1945 г. з заснавання Брэсцкага настаўніцкага інстытута, быў пераўтвораны ў Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна. У 2001 г. у ім быў створаны Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў. У 2000 г. Брэсцкі політэхнічны інстытут, заснаваны ў 1966 г. як інжынерна-будаўнічы інстытут, быў пераўтвораны ў Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт. У 2005 г. на базе Аддзела праблем Палесся створаны Палескі аграрна-экалагічны інстытут НАН Беларусі.

Дынамічна развіваецца сярэдняя і сярэдняя спецыяльная адукацыя, адкрыты цэлы шэраг новых навучальных устаноў. З 1990 г. паспяхова дзейнічае ліцэй № 1 імя А. С. Пушкіна. Занялі годнае месца і гімназіі: № 1 (1992 г.), № 2, № 3 (1993 г.), № 4 (1995 г.), № 5 (1999 г.), № 6 г. імя Маршала Савецкага Саюза Г. К. Жукава (2003 г.). У 2003 г. для адораных навучэнцаў створаны Брэсцкі дзяржаўны абласны агульнаадукацыйны ліцэй (у 2005 г. яму прысвоена імя П. М. Машэрава). У 2014 г. у Паўднёва-Заходнім мікрараёне № 4 адкрыта новая сярэдняя школа № 1 на 1120 вучняў.

Брэстчына славіцца сваімі спартыўнымі дасягненнямі. Пачынаючы з 1960 г., скарбонку алімпійскіх медалёў Брэстчыны папоўнілі С. Макаранка, Л. Гейштар, Б. Ісачанка, Ю. Несцярэнка, Н. Гелах, Ю. Бічык, Н. Сазановіч, С. Мартынаў, А. Бацюшка і іншыя спартсмены. У Брэсце створаны буйныя сучасныя спартыўныя аб'екты высокага класа для правядзення спаборніцтваў міжнароднага ўзроўню: Брэсцкі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па веславанні (вяслярны канал), Брэсцкі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па гульнявых відах спорту "Вікторыя", Брэсцкі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па водных відах спорту, лёгкаатлетычны манеж, лядовы палац і інш. Цяпер прафесіяналы і аматары спорту ў Беларусі і за мяжой добра ведаюць футбольны клуб "Дынама-Брэст", гандбольны клуб "БГК імя А. П. Мяшкова".

Брэст з'яўляецца цэнтрам культурнага жыцця не толькі рэспубліканскага, але і міжнароднага значэння. У 2015 г. горад з'яўляўся культурнай сталіцай Беларусі, а ў 2019 г. стаў культурнай сталіцай СНД. Сталі вядомымі далёка за межамі Беларусі міжнародныя фестывалі, што праводзяцца ў Брэсце: Міжнародны фестываль класічнай музыкі "Студзеньскія музычныя вечары"

(з 1988 г.), Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва "Белая вежа" (з 1996 г.) і іншыя творчыя праекты. У горадзе беражліва захоўваюцца культурныя традыцыі. Дасягненні брэсцкіх тэатраў, бібліятэк, музеяў знайшлі заслужанае прызнанне з боку дзяржавы, айчыннай і замежнай грамадскасці. У 1992–1997 гг. брэсцкі мастак-эмальер М. Кузьміч займаўся аднаўленнем духоўнай святыні – Крыжа прападобнай Еўфрасінні Полацкай. 25 ліпеня 2009 г. у Брэсце на скрыжаванні вуліц Савецкай і Гогаля быў адкрыты помнік да 1000-годдзя горада з анёлам-захавальнікам на вяршыні і 6 скульптурамі (князя Уладзіміра Васількавіча, Вітаўта, М. Радзівіла Чорнага, алегарычнымі фігурамі маці, летапісца і салдата). Аўтарамі помніка з'яўляюцца скульптар А. Паўлючук і архітэктар А. Андраюк.

Наогул, на працягу 1000-гадовай гісторыі Брэст перажываў росквіт і заняпад, меў багатыя здабыткі і значныя страты, з'яўляўся прыдатным месцам для ўзаемадзеяння розных рэлігій, народаў. Шматлікія войны, пажары, эпідэміі і іншыя бедствы былі пастаяннымі і бязлітаснымі спадарожнікамі ў гісторыі Брэста. Нягледзячы на гэта, горад унёс вялікі ўклад у айчынную і сусветную гісторыю, культуру. Многія лёсавызначальныя падзеі міжнароднага значэння былі звязаны з Брэстам у мінулым. Дабрабыт і слава Брэста працягваецца плённай і стваральнай працай калектываў прадпрыемстваў і ўстаноў, талентам, ведамі, майстэрствам і вопытам людзей розных пакаленняў і прафесій, нацыянальнасцяў і веравызнанняў, ашчадным захаваннем і памнажэннем найлепшых традыцый. Таму 1000-гадовая гісторыка-культурная спадчына Брэста з'яўляецца добрай натхняльнай асновай для яго цяперашняга і будучага развіцця.

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Брест в 1919–1939 гг. : док. и материалы / сост. А. Г. Карапузова [и др.] ; гл. ред. Е. С. Розенблат. – Брест : Альтернатива, 2009. – 308 с.

2. Брест в 1941–1944 гг. Оккупация : док. и материалы. – Брест : Альтернатива, 2016. – 316 с.

3. Вабішчэвіч, А. Крэпасць і горад Брэст-Літоўск у час Першай сусветнай вайны паводле сведчанняў відавочцаў / А. Вабішчэвіч // Беларус. гіст. часопіс. – 2015. – № 8. – С. 5–13.

4. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экоперспектива, 2008. – Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – 688 с.

5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 613 с.

6. Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / М. В. Нікалаеў. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. – 423 с.

7. Глава государства принял участие в сессии Брестского областного Совета депутатов и представил на утверждение нового губернатора Брестской области Константина Сумара. – Официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.president.gov.by/ru/news_ru/view/glava-gosudarstva-prinjal-uchastie-v-sessii-brestskogo-oblastnogo-soveta-deputatov-i-predstavil-na-1972/. – Дата доступа: 15.04.2019.

8. Горбачев, А. Заглянем в 2000-й / А. Горбачев // Заря. – 1969. – 24 мая. – С. 3.
9. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 1-п. Воп. 22. Спр. 23.
10. ДАБр. – Ф. 1-п. Воп. 28. Спр. 17.
11. ДАБр. – Ф. 1-п. Воп. 28. Спр. 21.
12. Март 1918 года. На изломе истории … : материалы междунар. науч.-практ. конф. исслед., преподавателей, музейн., библ. и арх. работников, Брест, 14–15 марта 2018 г. ; редкол.: Г. Г. Бысюк [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2018. – 124 с.
13. Памяць : гіст.-дак. хроніка Брэста : у 2 кн. – Мінск : БЕЛТА, 2001. – Кн. 2. – 687 с.
14. Сердечные поздравления // Заря. – 1969. – 24 мая. – С. 1.

*А. М. Вабішчэвіч,*
*загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў,*
*доктар гістарычных навук, прафесар*